# ВЯСКОВАЯ СУБКУЛЬТУРА І ЯЕ АДЛЮСТРАВАННЕ Ў ТВОРАХ ЯКУБА КОЛАСА

**А.І.Смолік,** *доктар культуралогіі, прафесар, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

Вясковая субкультура – з’ява шматгранная, якая раскрывае сялянскі лад жыцця, заснаваны на падзяляемых большасцю жыхароў каштоўнасцях. Функцыянальна гэтая субкультура накіравана галоўным чынам на забеспячэнне вытворчасці сродкаў падтрымання вітальнага існавання людзей, у першую чаргу прадуктаў харчавання. Селянін – працаўнік універсальны: і земляроб, і жывёлавод, і рыбак, і плотнік адначасова. Літаратурныя коласаўскія героі жывуць у асяроддзі, дзе праца – неабходнасць жыцця. Так, дзядзька Антось “быў рыбак выдатны” [3, с. 117], у “дзеле тым пчаліным вёў першы рэй” [3, с. 133], “меў ахвоту і да дзічы” [12, с. 188]. *Праца* для коласаўскага селяніна з’яўляецца вышэйшай каштоўнасцю. У большасці яго паэтычных і празаічных твораў яна выступае справай натхнёнай, радаснай. Так, малюнкі сялянскай працы, пададзеныя ў паэме “Новая зямля”, па духу, па танальнасці мажорныя.

У літаратурнай спадчыне Коласа сялянская праца паўстае ў яе каляндарным цыкле – ад вясны да зімы. Ворыва, сяўба, касавіца, жніво, малацьба ўзнаўляюцца прачулымі, узнёслымі, задушэўнымі паэтычнымі карцінамі. У адрозненне ад некаторых пісьменнікаў, якія акцэнтавалі ўвагу на момантах знясілення, стомленасці чалавека, які шмат фізічна працуе, Якуб Колас паказвае працу як паэтычную стыхію, якая прыносіць радасць, задавальненне. Прыгожай, паэтычнай падаецца ім нават звычайная, будзённая, чорная работа.

Такім чынам, прыгожае і утылітарнае ў Коласа выступаюць у цесным адзінстве. На наш погляд, увасабляючы гэта адзінства, паэт абвяргае ідэю ідэалістычнай эстэтыкі, што пачуццё прыгожага ўласціва нібыта толькі людзям духоўнай, інтэлектуальнай дзейнасці і зусім чужое людзям фізічнай працы.

У творах Коласа авеяна паэзіяй не толькі сама праца, але і яе шматлікія прылады, рэчы штодзённага, практычнага ўжытку, створаныя рукамі селяніна: “сярпок крывенькі просіць дзела” [3, с. 247], “цапы віселі, бы заснулі” [3, с. 136], “А тыя ж граблі ці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цапочкі! Ну, толькі цешыць імі вочкі!” [3, с. 167]. Але галоўнай радасцю жыцця селяніна, падкрэслівае паэт, можа стаць толькі вольная праца. Таму коласаўскія літаратурныя героі ўсяляк імкнуцца пазбавіцца паднявольнай працы. Міхал з паэмы “Новая зямля” імкнецца займець уласную зямлю, Сымон-музыка і парабак Яўхім уцякаюць са Шлёмавай карчмы, жыхары Выганаў і Высокага змагаюцца з панам Скірмунтам за права карыстацца затокамі і сенажаццю. Сяляне – людзі працы, яна для іх сэнс жыцця, і яны самі хочуць распараджацца здабыткамі сваіх рук.

Сярод важнейшых каштоўнасцей сялянскай субкультуры вылучаецца *свабода.* Свабода ў творах Якуба Коласа – катэгорыя ўсёабдымная. Гэта і свабода нацыянальная, і свабода асабістая, свабода кожнага. Колас паказвае, што паднявольнае становішча, неабходнасць шапкаваць перад панамі – прадмет штодзённай душэўнай пакуты сялян. Жыхары вёскі намаляваны пісьменнікам разумнымі, дасціпнымі, сумленнымі, з пачуццём уласнай годнасці. Яны не хочуць мірыцца з сацыяльнай несправядлівасцю, імкнуцца вызваліцца з панскіх пут. Таксама і ў апавяданнях Я.Коласа “Дзяліцьба”, “Кірмаш”, “Кажух старога Анісіма”, “Бунт”, “Нёманаў дар” [1] і іншых паказваецца абуджэнне беларускай вёскі, павольны, але няўхільны пратэст сялянства, мара аб новай, лепшай будучыні. Зямля і свабода для сялян з’яўляюцца словамі-сімваламі.

Сялянская субкультура ўтрымлівае шматвяковую *мараль, этыку,* якімі кіруюцца вяскоўцы ў паўсядзённым жыцці. Маральна-этычныя праблемы досыць яскрава адлюстраваны ў навелах, якія сабраны пад назвай “Казкі жыцця”. Пісьменнік імкнецца засяродзіць увагу чытача на душэўнай дабраце народа, на ўласцівым яму пачуцці справядлівасці.

Добрае Колас шукае ў звычайным чалавечым характары. Мастацкая адметнасць сялянскіх вобразаў у тым, што паэт зусім не прыхарошвае іх, паказвае духоўны свет звычайных вясковых жыхароў, такіх, напрыклад, як Міхал і Антось. Альтруізм Антося праяўляецца перш за ўсё ў тым, што для яго зусім натуральна спачуваць, дапамагаць не толькі блізкім, якімі з’яўляюцца брат, яго жонка, дзеці, а і тым жа, скажам, вяскоўцам. Малыя адчуваюць дабрату, шчырасць, чысціню дзядзькавай душы. Добразычлівыя адносіны ў Антося з іншымі людзьмі. Вакзальны вартаўнік Доніс Драка шчыра спрыяе Антосю, каб пасадзіць яго “зайцам” у пасажырскі цягнік, і ўвогуле выказвае ўсе адзнакі шчырай прыхільнасці. Гэтак жа лёгка зближаецца ў Вільні Антось з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грышкам Верасам, які, як і дзядзька, аказваецца перш за ўсё чалавекам добрым, што гатовы паспрыяць у бядзе нават незнаёмаму стрэчнаму. Коласаўскім героям уласцівы любоў да ўсяго жывога, вера ў дабро і ў людзей, душэўная непасрэднасць, праўдзівасць.

На традыцыйнай маралі трымалася вясковая *сям'я.* У трылогіі "На ростанях", паэме "Новая зямля" шырока паказваецца ўнутранае жыццё сям'і, адносіны паміж дарослымі членамі сям'і, размеркаванне працы і інш. Высокім паэтычным пафасам прасякнуты малюнкі сямейнага жыцця. Узаемаадносіны паміж Міхалам і Ганнай характарызуюцца глыбокай інтымнасцю, даверлівасцю, эмацыянальнай прыхільнасцю. Жыццё лесніковай сям'і цячэ павольнай плыняй паўсядзённай працы, бытавых клопатаў, дзе маюць сваё значэнне самыя непрыметныя на першы погляд дробязі. У вясковых сем'ях існавала строгае размеркаванне працы на "мужчынскую" і "жаночую". Мужчына araў поле, сеяў, касіў, малаціў, рамантаваў жытло і інш. Абавязкам жанчыны ў сям'і было гатаванне ежы, выраб тканіны для інтэр'ера, адзення, клопат пра парадак у хаце, догляд за дзецьмі і інш. Жанчына шыла, мыла бялізну, прыбірала ў хаце, працавала ў агародзе, жала, дапамагала мужчынам на сенакосе. Сяляне імкнуліся прывучаць дзяцей працаваць на зямлі, хадзіць за жывёлай, таму з ранняга ўзросту дзеці бралі пасільны ўдзел у выкананні той ці іншай сялянскай справы.

Сялянская сям'я выступала мікраасяродкам трансмісіі культуры. Менавіта ў сям'і дзеці не толькі атрымлівалі практычныя навыкі да працы, але засвойвалі розныя звычаі і абрады, у якіх яны непасрэдна ўдзельнічалі. У сям'і фарміраваўся і будучы носьбіт, і спажывец гэтай культуры. Сістэма выхавання дзяцей і моладзі абапіралася на традыцыйную народную абраднасць, заснаваную на прынцыпах, нормах народнай этыкі і маралі.

Для сялянскіх сем'яў былі характэрны своеасаблівая вясковая гамагеннасць, вузкалакальная культурна-бытавая замкнёнасць. Гэта праявілася ў стварэнні ўстойлівых спадчынных найменняў (прозвішчаў). Іншы раз ужывалася таксама мянушка, якая калі і захоўвалася, то толькі ў наступным пакаленні. Праўда, аналіз этнакультурных тэндэнцый сведчыць, што ў XIX ст. актывізаваўся працэс складвання трохкампанентнай сістэмы найменняў, калі на аснове імён па бацьку і імён-мянушак паступова замацаваліся міжпакаленныя сямейныя прозвішчы. Гэта з'ява знайшла

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адлюстраванне ў паэме “Новая зямля”, калі асобных сваякоў называюць па мянушцы.

Існаванне такіх пастаянных назваў стабілізавала ўнутрысямейныя як сінхронныя, так і дыяхронныя сувязі, якім належыць значная роля ў трансмісіі этнакультурнай традыцыі, асноўнымі творцамі і захавальнікамі якой былі вясковыя жыхары.

*Вуснапаэтычная народная творчасць* з’яўляецца арганічнай часткай вясковай субкультуры. Асноўнымі жанрамі і відамі народнай паэтычнай творчасці беларусаў былі казкі, легенды, жарты, прыказкі, прымаўкі, загадкі, прыгаворкі, заклічкі, замовы. Шырокае распаўсюджванне ў субкультуры сялянства атрымалі лірычныя любоўныя, сямейна-бытавыя песні, балады, з каляндарна-абрадавай паэзіі – валачобныя, купальскія, жніўныя, восеньскія песні. Гэтымі і іншымі жанрамі вуснай народнай творчасці насычаны шматлікія літаратурныя творы Я.Коласа. Напрыклад, вясковыя прыпеўкі ўведзены ў апавяданні “Кірмаш”, “На начлезе”, “Знайшлі” [1] . У творах “Калодка пчол”, “Тоўстае палена”, “Злавіў” [1] пісьменнік звяртаецца да такога жанру, як праклён, у паэмах “Сымон-музыка”, “Новая зямля” [3], трылогіі “На ростанях” [2] – да народных легендаў і паданняў.

Сялянская субкультура насычана своеасаблівым *моўным вопытам*, які па-мастацку апрацаваны Якубам Коласам і шырока прадстаўлены ў яго творчай спадчыне. Аснова мовы пісьменніка – бытавая народна-гутарковая мова. Эмацыянальная насычанасць і разам з тым гранічная прастата мовы вяскоўцаў праяўляюцца ва ўжыванні ідыяматызмаў, сінонімаў і фразеалагізмаў. Яны як бы акумуліруюць раствораную ў вяках народную практыку і думку, мастацкае бачанне свету, бо ў іх абавязкова прысутнічае эмацыянальна-вобразная ацэнка той ці іншай жыццёвай з’явы.

З элементаў народнай ідыяматыкі ў мове твораў Коласа знайшлі адлюстраванне такія, напрыклад, адзінкі малых формаў беларускага фальклору, як кленічы. У трылогіі “На ростанях” пісьменнік шырока ўводзіць у тэкст кленічы, якія бытавалі на Палессі: “Бярэ рубель, – з зайздрасцю прамовіў Кукса: – а каб цябе, гад, за жывот узяло” [2, с. 111]; “ А гарбузы з гарода ў Рамковых хто цягаў, каб з цябе кішкі павыцягалі?” [2, с. 47].

Неацэннай каштоўнасцю сялянскай субкультуры з’яўляюцца *талерантнасць, цярпенне*, тая спрадвечная цягавітасць, што ляжыць у аснове гістарычнага народнага аптымізму, жыццесцвярджальнасці нават у самых цяжкіх абставінах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці сялянскай субкультуры таксама моцна праяўляюцца ў *побыце і гаспадарча-вытворчай дзейнасці*. Сельскагаспадарчы спосаб вытворчасці абумовіў своеасаблівы характар забудовы і планіроўкі беларускай вёскі. У творах Я.Коласа можна знайсці падрабязнае апісанне сельскіх паселішчаў розных куткоў Беларусі. З трылогіі "На ростанях" бачна, што асноўным тыпам вёскі быў вулічны тып, але ў асобных рэгіёнах існаваў бессістэмны, або кучавы, тып. Вось як апісвае Колас забудову палескай вёскі Цельшына: "Невялічкая вёска ў адну вуліцу выглядала непрыветна... Вуліца была роўная і шырокая... Хаты былі пераважна новыя, пабудаваныя з тоўстага і гладкага лесу. У размяшчэнні гаспадарскіх будынін на двары таксама не было пэўнага парадку і сістэмы, а ўсё было навалена, як папала". Некалькі іншы тып забудовы ўяўляла валасная вёска Хатовічы: "Вёска была досыць вялікая, цягнулася ў адну лінію, і толькі каля цэркаўкі на ўзгорку хаты гуртаваліся гусцей і шырэй. Злева, пры канцы вёскі, стаяў дом валаснога праўлення з двума высокімі чырвонымі комінамі пад пачарнелым дахам. Насупраць, на другі бок вуліцы, выглядала школа з белымі аканіцамі..." [2, с. 18].

У трылогіі мы знойдзем малюнкі мястэчка Панямонь [2, с.184], вёсак Мікуцічы [2, с. 228], Выганы [2, с. 247], Верхань [2, с. 366] і інш.

Не абыдзена ўвагай дэталёвая характарыстыка жылых і гаспадарчых пабудоў. Комплекс пабудоў сельскіх сядзіб уключаў хлявы, або аборы, свірны, гумны, адрыны і інш. У паэме "Новая зямля" шмат старонак прысвечана мастацкаму апісанню, здавалася б, звычайных гаспадарчых пабудоў.

З творчай спадчыны Я.Коласа вынікае, што характар вясковага жылога асяроддзя меў традыцыйныя, узятыя са старажытных часоў формы, якія паступова дапаўняліся новымі элементамі, звязанымі з развіццём культуры дойлідства.

Вясковае адзенне вылучаецца адметнасцямі, якія абумоўлены саслоўнымі асаблівасцямі. На працягу многіх стагоддзяў склаўся своеасаблівы народны касцюм беларуса. Аналіз твораў Я.Коласа сведчыць: асновай як жаночага, так і мужчынскага вясковага касцюма была кашуля. Так, "дарэктар" у паэме "Новая зямля" быў апрануты у зрэбныя порткі і кашулю, на нагах былі лапці. У якасці верхняга адзення на Яську быў "халат суконны, сівы" [3, с. 151]. Прыкладна так былі апрануты і паляшуцкія дзеці: "Усе вучні былі абуты ў лапці, насілі, як і старыя палешукі, суконныя світкі, чорныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

або светлыя" [3, с. 34]. Даследаванне коласаўскіх тэкстаў дае падставу для высновы, што характэрным матэрыялам вясковага адзення беларусаў было сукно, галоўным чынам мясцовай вытворчасці, сыравінай для яго вырабу служылі лён, каноплі і воўна. Сяляне выраблялі сукно самі, а таксама куплялі ці абменьвалі. Больш выразныя і падрабязныя характарыстыкі вясковага адзення можна знайсці на старонках рамана "На ростанях": "Яму падабалася паляшуцкая вопратка дзядзькі: чорная выцвіўшая суконная світка, пашытая да стану, шырокі ў чырвоныя палоскі даматканы пояс і шапка-кучомка свайго вырабу" [2, с. 16].

Многія творы коласаўскай спадчыны прасякнуты паэтызацыяй сялянскай ежы. У раздзеле "За сталом" паэмы "Новая зямля" паэт паказвае, чым звычайна харчавалася сям'я Міхала. На стале былі грэцкія аладкі, хлеб, верашчака, "тварог, запраўлены смятанай" [2, с. 50]. Распаўсюджанай і таксама міфалагічна рытуалізаванай стравай у вясковых жыхароў былі бліны.

Значная колькасць страў беларускай вясковай кухні рыхтавалася з прымяненнем прадуктаў жывёлагадоўлі, рыбалоўства і палявання. Мяса і рыбу смажылі, варылі, вялілі, вэндзілі, што значна пашырала асартымент ежы. У паэме "Новая зямля" рассыпана шмат мастацкіх замалёвак святочнага сялянскага стала.

Значнае месца ў вясковай субкультуры займаюць *святы.*

Свята ў творчай спадчыне Я.Коласа разглядаецца як інстытут культуры, яно выступае як грамадская падзея ўрачыстага характару, адасобленая ад паўсядзённасці. Гэты непрацяглы адрэзак часу мае асаблівую сувязь са сферай сакральнага і прадугледжвае максімальнае дачыненне да яе ўсіх удзельнікаў свята. Святочная культура беларусаў не толькі структуравала і ўпарадкоўвала час гаспадарчай дзейнасці чалавека, але і вызначала тэрміны правядзення свят.

Якуб Колас, сам сялянскі сын, дасканала ведаў святы традыцыйнага народнага календара, хрысціянскія святы, святы сямейнародавага цыкла (нараджэнне чалавека, хрэсьбіны, вяселле і інш.).

Я.Колас уяўляў святы як канцэнтрацыю жыцця, вынік стваральнай працы на зямлі-карміцельцы, творчай дзейнасці чалавека, яе плёну. Усе атрыбуты свята створаны розумам і рукамі чалавека, у святочных абрадах і рытуалах яны набываюць сакральнае значэнне. Семантызацыя артэфактаў адбываецца ў працэсе падрыхтоўкі да свята і ў рытуалах. Выключна ўсе героі паэмы ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да свят. Напярэдадні Каляд Кастусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з дзядзькам Антосем ідуць на рэчку, каб налавіць рыбы да святочнага стала. Астатнія члены лесніковай сям'і выконваюць іншыя віды працы, каб не займацца ёю ў святочныя дні. Традыцыйная святочная культура беларусаў патрабуе актыўнага ўдзелу ў абрадах і рытуалах усіх суб'ектаў соцыуму. Гэта тлумачыцца тым, што сродкамі святочнага дзейства ў памяці людзей узнаўляюцца вышэйшыя каштоўнасці быцця, з якімі звязаны сэнс існавання чалавека.

Абавязковым кампанентам святочнага дзейства ў вясковай субкультуры з'яўляюцца многія прадметы. Напрыклад, рытуальнае значэнне на Каляды мае сена. На калядны стол клалі сена як напамінак аб тым, што Ісус Хрыстос нарадзіўся ў яслях. Аб гэтым добра ведалі ў сям'і Міхала і бездакорна выконвалі ўстаноўлены рытуал. Кампанентам велікоднага свята былі дары працы, якія асвячалі ў царкве.

Важнейшым атрыбутам вызначэння святочнага статусу з'ўляецца адзенне. Кожны ўдзельнік свята імкнуўся аздобіць сябе новай вопраткай, якая б адпавядала сутнасці таго або іншага свята. Я.Колас паказвае, што ўся сям'я Міхала ніколі не сустракала свята ў будзённым адзенні. Вопратка заўжды была чыстая або новая.

У якасці абрадавага рытуальнага кампанента ў святочнай культуры нярэдка выступалі прадметы гаспадарчай дзейнасці: каса, павозка, стол, ручнік і інш. Яны таксама аздабляліся напярэдадні свята, прыводзіліся ў належны парадак і выкарыстоўваліся ў святочных дзействах. У паэме Я. Колас часта малюе сцэны падрыхтоўкі прадметаў быту да таго або іншага свята. Перад паездкай да царквы «Антось агледзеў тут прылады, Калёсам добра даў "памады"» [3, с. 232]. Напярэдадні агляду зямлі "Міхал з Антосем воз прыбралі" [3, с. 257].

Функцыю святочнага атрыбута ў традыцыйнай культуры беларусаў выконвалі і прадметы прыроднага паходжання. Так, леснікова хата аздаблялася галінкамі дрэў, двор пасыпаўся жоўтым пясочкам. На Каляды ў хаце ладзілася ёлка, якая ўпрыгожвалася цукеркамі, арэхамі.

Надзвычай вялікая ўвага надавалася беларусамі выбару прасторы, дзе адбывалася свята. Месцам правядзення свят маглі служыць луг, поле, вуліца, двор, лес і інш. Я.Колас вельмі дэталёва раскрывае ролю адкрытай і закрытай святочнай прасторы. Большасць свят, пра якія ідзе гаворка ў паэме (Каляды, Вялікдзень і інш.), адбываюцца ў лесніковай хаце і двары.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цэнтрам святочнай прасторы заўсёды з’яўлялася царква. Кожны элемент храма і яго мастацкае аздабленне маюць сімвалічны сэнс і тлумачэнне (Космас, Цела Хрыстова, Дом Гасподзень, Іерусалімская горніца). Храм вылучаецца сярод местачковай і гарадской забудовы сваімі памерамі, манументальнымі формамі, дэкаратыўным убраннем. Ён найчасцей размяшчаўся на вузлавых участках населеных пунктаў.

Святочная прастора ў паэме паказана як сфера эстэтычнага. Сузіранне яе шматколернасці, гарманічнай прыгажосці выклікае ў герояў паэмы не толькі захапленне, святое трапятанне сэрца, але прыносіць заспакаенне, дае жыватворныя сілы, надзеі на лепшую будучыню.

У святочнай вясковай субкультуры вялікую ролю адыгрывае *слова*. Святочнае дзейства заўсёды суправаджалася ўключэннем энергетычнага патэнцыялу слова. З дапамогай слова ў рознай форме (песні, прытчы, казкі, загадкі, святочныя пажаданні, малітвы і інш.) чалавек зносіўся з Богам, святымі, памерлымі (продкамі), навакольнай прыродай. Я.Колас асабліва ўважліва адбірае моўны матэрыял пры абмалёўцы святочных падзей і характарыстыцы ўдзельнікаў свята.

Функцыянальную накіраванасць маюць у паэме пажаданні, з якімі звяртаюцца Міхал, Антось і іх госці за святочным застоллем. Яны жадаюць адзін аднаму здароўя, даўгалецця, не ведаць гора і смутку. Пажаданні напоўнены спадзяваннямі на добры ўраджай, багаты прыплод хатняй жывёлы, прыбытак у гаспадарцы.

Падсумоўваючы сказанае, адзначым, што ў духоўнай спадчыне Я.Коласа адлюстраваны шматлікія элементы святочнай вясковай культуры беларускага народа. Многія коласаўскія творы можна лічыць своеасаблівай энцыклапедыяй па айчыннай культуралогіі. Акрамя багатага пласта святочнай культуры, у творах Я.Коласа грунтоўна паказаны сацыяльныя субкультуры і іншыя формы нацыянальнай культуры беларусаў. У сваёй творчасці пісьменнік праз увасабленне элементаў вясковай субкультуры імкнуўся асэнсаваць першавытокі духоўнасці народа, спасцігнуць самабытны характар, сутнасць этнанацыянальнага духу, месца і ролю народа ў беларускай культуры. Гэтая сапраўды рэфлексійная дзейнасць творцы пераўтварылася ў своеасабліва выказаныя народным паэтам культуралагічныя ідэі, паняцці, сімвалы. І менавіта ў гэтым сэнсе творчасць Я.Коласа прасякнута

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуратворчымі і культуралагічнымі інтэнцыямі, якія набываюць форму мастацка-вобразнага спасціжэння культуры.


1. *Колас, Якуб.* Зб. твораў: у 14 т. / Якуб Колас. – Мн., 1973. – Т. 4.
2. *Колас, Якуб.* На ростанях: трылогія / Якуб Колас. – Мн., 1958.
3. *Колас, Я.* Новая зямля: паэма / Я.Колас; агульн. рэд., паслясл. Я.Янушкевіча; уклад.: У.Гілеп, Я.Янушкевіч; прадмова М.Мушынскага; пер. на рус. С.Гарадзецкага [і інш.]; пер. на польск. Ч.Сэнюха; камент. М.Мушынскага, Я.Янушкевіча; маст. В.Шаранговіч. – Мн., 2002.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ